

Францішак Скарына

БЕЛАРУСКІ СЬВЕТ
BYELORUSSIAN WORLD

NO. 3(32) - 1978



Асоба Ф. Скарыны надзвычай прыцягальная для мастакоў. Чаму менавіта Скарыне «пашанцавала» больш за іншых дзеячаў нацыянальнай культуры мінулага? Пэўна, тут адыграла ролю надзвычайная важнасць зробленага ім — друкаванне першай беларускай кнігі. Але натхняе мастакоў адчуванне роднаснай натуры. Колькі цудоўных гравюр у выданнях Скарыны! З якой любоўю і майстэрствам аздабляў ён кнігі. І нястомна дбаў пра асвету свайго народа, каб яго землякі, гаворачы словамі пазнейшага паэта, змаглі «людзьмі звацца».

© PDF: Kamunikat.org 2018 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2018



“А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?”
— Выдатныя людзі Беларускага Народу.

Пятрусь БРОУКА

Яшчэ ў дні старыя, у век наш лучынны
Аб горадзе Полацку слава ішла, —

Друкар там выдатны Францішак Скарына,
Што зоры, рассыпаў па роднай краіне,

Крыштальныя словы навукі — сьвятла;
Нямала народаў з крыніц яго піла

У літарах першых знаходзячы сілу...
І брала ад мудрасьці вечны агонь,

Ты слаўна, зямля, што вякам нарадзіла
Такога выдатнага сына свайго!

ФРАНЦІШАК СКАРЫНА

У канцы 15 і на пачатку 16 стагоддзяў пачаўся на Беларусі буйны росквіт гарадоў. Штораз болей сярод самых вялікіх і багатых з іх здабывалі ад вялікага князя правы на самакіраваньне па магдабурскаму праву. Магдабурскае права спрыяла эканамічнаму разьвіцьцю гарадоў.

Адначасова з разьвіцьцём рамяства, гандлю і пашырэньня гандлёвых і палітычных сувязяў з іншымі краінамі павялічвалася зацікаўленьне асьветай, асабліва сярод гарадскога насельніцтва. Школы паўставалі ня толькі пры цэрквах і манастырах, іх засноўвалі таксама добрачынныя арганізацыі гараджан — брацтвы. Хоць у кожнай школе вучылася ня больш дзесяці - дваццаці вучняў, а навука працягвалася ад 1 да 3 гадоў, школы выдатна спрыялі пашырэньню граматы і разьвіцьцю культуры на беларускіх землях.

Адным з выдатных дзеячоў навукі, асьветы і культуры ў Беларусі быў Францішак Скарына. Нарадзіўся ён каля 1490 года ў Полацку ў сям'і багатага купца. У сваім родным горадзе атрымаў Скарына грунтоўную пачатковую адукацыю. Затым выехаў на далейшую вучобу ў Кракаўскі унівэрсытэт у Польшчы, а пасьля яго заканчэньня ў Падуанскі унівэрсытэт у Італіі. У Падуанскім унівэрсытэце ён з вялікім посьпехам здаў экзамены на вучоную ступень доктара мэ-

дыцыны, выказваючы пры гэтым валоданьне глыбокімі і абшырнымі ведамі.

Пасьля заканчэньня адукацыі Скарына ўсяцэла прысьвяціў сябе справе наладжаньня друкаваньня кніг на беларускай мове. Ён заснаваў у чэскай Празе беларускую друкарню і ў 1517 годзе выпусьціў у сьвет першыя беларускія друкаваныя кнігі. Кіраваў ён іх "людзям простым для добрай навукі".

Хоць друкаваньне кніг у Празе адбывалася вельмі пасьпяхова, і беларускі першадрукар карыстаўся сярод чэхаў прыхільнасьцю і добразычлівасьцю, аднак ён імкнуўся быць бліжэй да родных мясьцін. Ён перавёз з Прагі ў сталіцу Вялікага Княства Літоўскага, горад Вільню, сваю друкарню і там працягваў сваю друкарскую дзейнасьць.

У хуткім часе кнігі Скарыны пашыраюцца па ўсім Вялікім Княстве Літоўскім і вандруюць у іншыя краіны. Усюды яны зьяўляюцца ня толькі ўзорам дасканалай тэхнікі кнігадрукаваньня, але і прыкладам ахвярнага служэньня адукаванага чалавека свайму народу.

Скарына прызначаў свае кнігі простаму народу. У прадмовах да іх ён раіў чытачу шукаць у кнігах навуковых зьвестак і праўды для адукаваньня самога сябе. Ён пісаў, што "бяз мудрасьці і бяз добрых звычаяў нельга пачціва жыць простым людзям на зямлі". Паводле Скарыны, кожны чалавек павінен жыць ня толькі для самога сябе, ён сваёй дзейнасьцю абавязан як мага болей прыносіць карысьці свайму народу, бо "ня толькі самі сабе нараджаемся на сьвет", але перад усім для "агульнага дабра". Беларускі першадрукар заклікаў, каб людзі "ўсякай працы і багацьцяў для агульнага дабра і для айчыны свае не шкадавалі".

Скарына горача любіў сваю радзіму. Ён пісаў: "Так як зьвяры, блукаючыя ў пустыні, знаюць логавы свае, птушкі, лётаючыя ў паветры, ведаюць гнёзды свае, рыбы, плываючыя ў моры і ў рэках, чуюць віры свае, пчолы і ім падобныя бароняць вульляў сваіх, так і людзі, дзе нарадзіліся і выгадаваліся, да таго месца вялікую любоў захоўваюць".

Скарына карыстаўся вялікім аўтарытэтам і пашанай ня толькі ў Вялікім Княстве Літоўскім, але па-за яго межамі. Яго запрашаў да сябе прускі гэрцаг, называючы яго "мужам непараўнанага розуму, найвучонейшым доктарам мастацтваў і мэдыцыны". Чэскі кароль запрасіў Скарыну на свой двор і даручыў яму абавязкі каралеўскага батаніка і мэдыка.

Памёр Ф. Скарына каля 1540 года ў Празе.

Дзейнасьць беларускага першадрукара зрабіла магутны ўплыў на далейшае разьвіцьцё беларускай культуры і прычынілася да ўмацаваньня сувязяў паміж славянскімі народамі.

□ – □

Я. Колас

У ГЛЫБІ ПАЛЕСЬСЯ

НА БАЦЬКАУШЧЫНЕ

працяг

VII

Тутэйшым "інтэлігэнтам" чалавек, што стаяў цяпер каля парога, быў добра знаёмы. Яго зьяўленьне нікога ня зьдзівіла. На яго прывітаньне ніхто не азваўся, бо ўсе былі ў гарачцы апошняй здачы карт. Новым ён быў толькі для маладых настаўнікаў. Няясная ў змроку постаць яго выплыла на сярэдзіну класа, дзе было сьветла.

Лысы, лоб круты, маршчыністы. Сам сутулаваты, прысадзісты. Адзеты бедна, але па-інтэлігэнцку. Зьверху цёмная, па канцах рыжаватая барада яго пачыналася ледзь ня ад самых вачэй. Бровы навіслыя, густыя. Твар пануры і часта мяняецца. Вочы неспакойныя, часамі глядзяць нейк дзіка, і іх выраз таксама зьмяняецца часта. З вушэй тырчаць цэлыя кусты густых валасоў. Гаворыць чотка, выразна, гладка, нават красамоўна. У некаторых пунктах размовы звонка б'е далоньню аб далонь. На выгляд яму гадоў пад пяцьдзесят. Гэта быў ні хто іншы, як "рэдактар". Сапраўднае-ж прозьвішча яго было Бухберг.

Рэдактар таксама быў настаўнікам. У яго вышлі нелады з народам Іеговы, сынам якога ён быў, і школу прышлося пакінуць. Ён рэзка нападаў на звычкі свайго народу, жорстка высьмейваў яго забабоны і, як той старажытны біблейны прарок, бічаваў яго акасьцянеласьць і кансэрватызм. Праціўнікі называлі яго "місюгінэ", што значыць вар'ят, і хацелі пабіць каменьнямі. Была раз рукапашная стычка з імі, але ён паразьмятаў іх сілаю і крэпасьцю кулакоў сваіх.

Ніхто не даваў яму дапамогі, і рэдактару прыходзілася вельмі цяжка. Але ён гнуў сваю лінію і ні на якія кампрамісы ня ішоў. Ён быў дапісчыкам правінцыяльнай газэты і выкрываў "язвы на грамадзкім целе". Але рэдактар не здавольваўся роляю дапісчыка. У галаве яго было многа ўсякіх ідэй. Адна такая ідэя — прыступіць да выданьня панямонскай газэты. Ён разьвіваў і прапагандаваў гэтую ідэю сярод панямонскай інтэлігенцыі. Але словы яго падалі на камяністы грунт і засыхалі, не даўшы прорасьці, бо ніхто на іх не адгукнуўся. Тады рэдактар махнуў на ўсіх рукою і ўзяўся за газэту сам адзін. Яго газэта называлася " Панямонскія ведамасьці". Уся яна ад пачатку да канца складалася самым рэдактарам. Газэта выходзіла раз у два тыдні. Тыраж яе быў ад 10 да 15 экзэмпляраў. Рассылалася яна ня па пошце: сам рэдактар прыносіў яе на кватэры сваіх падпісчыкаў у рукапісным выглядзе. Цана нумара значылася: 10 кап.

Досыць дзіўныя былі адносіны паміж рэдактарам і падпісчыкамі: падпісчыкі пабойваліся рэдактара, а рэдактар пабойваўся пад-

пісчыкаў, каб яны часамі не адмовіліся купляць яго газэту. Рэдактару прыходзілася ламаць галаву, хітрыць, пускацца на ўсякія выдумкі, выбіраць жанр і форму ў дастасаваньні да панямонскага жыцьця і да характару самых панямонцаў.

Рэдактара часта можна было бачыць у розных кутках Панямоні. Хадзіў ён сур'ёзны, задумлены, да ўсяго прыглядаўся, прыслухоўваўся і часамі нешта запісваў у сваю патрэпаную кніжачку, прасякнутую потам.

Рэдактар спыніўся каля стала, шырока разьвёў рукі.

— Што я бачу! Змаганьне на зялёным полі!.. О, людзі, людзі!! Як далёка адышліся вы ад законаў разумнага жыцьця!

—Так, дружа, рэдактару, жыцьцё — гэта адвечнае змаганьне. І гора тым, хто будзе пераможаны! — тонам філосафа адказаў Тарас Іванавіч. Ён нават не павярнуўся ў бок рэдактара і ня ўсё чуў, што той сказаў: трэба было сачыць за платаю.

Памахайлік дадаў:

— У поце ліца твайго будзеш ты есьці хлеб свой.

— Ня трудзівыйся да ня яст, — уставіў і сваю ўвагу Найдус.

А рэдактар як-бы ня чуў нічога гэтага і казаў далей:

— Там, за гэтымі сьценамі, вялікі дом прыроды. Столь яго — неба, расквечанае зорамі. Памост — зямля, дзе чуецца дыханьне травы і красак. Там прастор, якому няма граніц. Там кніга адвечнай мудрасьці разгортвае свае таямніцы. Вы, у каго ёсьць вушы, каб чуць, і вочы, каб бачыць! Ідзіце на прастор, разьніміце крыльле мысьлі, каб пазнаць парадак рэчаў і атрэсьці фуз, бруд і пыл, бо імі засьлеплены вочы вашы, бо вы замкнуліся ў цесныя сьцены, вы прышлі ў катух, поўны смроду, вы атруцілі яго сваім дыханьнем.

— А сам рэдактар чаго прышоў у катух? — запытаўся Найдус, ня зводзячы з карт вачэй.

— Дзівак, дзівак, а што-небудзь ды змарозіць наш рэдактар! — адгукнуўся сядзелец і пусьціў сьмех у вусы.

І гэтыя словы рэдактар прапусьціў між вушэй. Ён трагічна патрос лысаю галавою.

— Эх, людзі, людзі! Адзябёлела сэрца ваша, і вушамі вы дрэнна чуеце. Як далёка, кажу вам, стаіце вы ад жыцьця! І калі вы, соль зямлі, страцілі салёнасьць, то што сказаць аб гэтых малых? Я бачу трупныя цені на вашых тварах. Рука прагавітасьці кладзе на іх свае пячаці і выводзіць зьвера з глыбінь вашае істоты. Бяссонныя ночы запісваюць на іх доўг свой, і вы аддасьце яго бясчаснаю старасьцю і болем змучанага цела...

Рэдактар яшчэ гаварыў, але яго ніхто ня слухаў. Да вушэй ігракоў далятаді толькі словы, але значэньне іх: звон срэбра і шолах бумажак глушыў іх. І да гэтага бічаваньня рэдактара панямонцы прывыклі, лічылі зьяваю звычайнаю, сам-жа рэдактар для іх быў чалавек, у якога "ня ўсе дома". А для вуха Лабановіча гэтыя словы гучалі дакорам, чулася ў іх горкая праўда і захованы сэнс.

Тарас Іванавіч уступіў месца Памахайліку. Ён вельмі ўдала пат-

роіў банк, пасьля чаго пайшоў піць піва.

Рэдактар змоўк. Вочы яго патухлі. Адвярнуўся ў другі бок, апусьціў уніз вочы і задумаўся, а потым надзеў парыжэлы капялюш і вышаў, нічога не сказаўшы. У "Хронiцы панямонскага жыцьця" трэба было зрабіць сякія-такія дадаткі. Ён пайшоў дамоў, у сваю цесную каморку, запаліў агарак сьвечкі і стаў пераглядаць сваю газэту — надыходзіў тэрмін яе выхаду ў сьвет. Перад рэдактарам ляжаў рукапісны аркуш паперы. Буйнымі літарамі ўгары гэтага аркуша было напісана:

ПАНЯМОНСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

Газэта пачыналася з перадавіцы. Перадавіца памечана:

Панямонь, 10 мая.

Наша мястэчка — досыць значны цэнтр у воласьці. Па перапісу 1897 году ў ім значыцца дзьве тысячы восемсот сорак чалавек насельніцтва. Прымаючы пад увагу натуральны прырост, мы ня зробім вялікае памылкі, калі скажам, што цяпер Панямонь мае тры з палавінаю тысячы насельніцтва. Між тым, у мястэчку ёсьць толькі дзьве пачатковыя школы: двухкласная міністэрская і аднакласная жаночая. Само сабою зразумела, што гэтыя школы ня могуць, далёка ня могуць абслугоўваць інтарэсы насельніцтва ў сэнсе задаваленьня яго патрэб у адносінах асьветы. Насьпела пільная, неадкладная патрэба ў адчыненьні новых школ у Панямоні.

Паўстае пытаньне: якую-ж школу мы павінны прапагандаваць у Панямоні? Якая школа можа найболей адпавядаць патрэбам і інтарэсам мястэчка і воласьці?

Рэдакцыя "Панямонскіх ведамасьцяў" бярэ на сябе сьмеласьць заявіць і гэтым выказаць агульнае жаданьне грамадзян Панямоні, што такою школаю можа быць толькі гімназія або прагімназія, але ва ўсякім разе ня ніжэй прагімназіі.

Як паказваюць факты, ні ў якой іншай воласьці не заўважаецца такога цягненьня моладзі да навукі, як у панямонскай. Чым гэта тлумачыцца? Воласьць наша малазямельная, зямля неўрадлівая. Стала быць, у аснове гэтай прагі моладзі да навукі ляжыць эканамічны фактар. Ну, фактары, разумеецца, могуць быць розныя Довід Пінхалес таксама быў "фактарам", а цяпер ён адчыніў сваю краму... Але мы адхіляемся ад нашае тэмы. Куды-ж ідзе наша моладзь? Дзе знаходзіць яна задаваленьне сваім імкненьням, свайму жаданьню? Шырокаю хваляю плыве яна ў настаўніцкія сэмінарыі, у гарадскія вучылішчы, плыве за дзесяткі і сотні вёрст пехатою, з лапцямі за плячамі, без капейкі ў кішэні. Але толькі нямногім шчасьліўчыкам удаецца папасьці ў гэтыя школы, пераважная-ж большасьць маладых людзей застаецца за парогам школы.

Колькі гора, колькі трагэдыяў перажывае наша сучасная моладзь! Адгэтуль і ясна, што наша Панямонь павінна мець школу павышанага тыпу, а такою школаю можа быць гімназія. Трэба даць ход нашай моладзі. Шырэй дарогу ў храм навукі! Няхай-жа закрасуе Панямонская гімназія!

ПА ВОЛАСЬЦІ

📖 Нам паведамляюць, што ў засьценку Пранукі былі ўжо два выпадкі пакражы коней у сялян. Паліцыя на чале з нашым бравым паважанымураднікам Тупальскім прымае энэргічныя меры да вылоўліваньня зладзеяў. Да гэтага часу напасьці на іх сьлед не ўдалося.

📖 Сяляне вёскі Красны Бераг ужо даўно судзяцца з адміністрацыяй князя

Радзівіла за сэрвітутную пашу. Апошнія капейкі выцягваюць з іх розныя дамарослыя адвакаты, але толку з гэтага няма. Акружны суд прысудзіў адабраць пашу ад сялян. Сяляне пераносяць справу ў судовую палату.

Не шкодзіла-б успомніць тут усім вядомую прыказку: "З багатым ня судзіся".

Апошнімі днямі, у зьвязку з сухою пагодаю, пачалі гарэць Радзівілаўскія лясы.

Каталіцкае насельніцтва воласьці, адміністрацыя князя Радзівіла, дробныя арандатары, а таксама і шляхта робяць захады да адчыненьня ў Панямоні касьцёла, зачыненага з 1863 году. Як нам удалося даведацца, касьцёл будзе адчынены; ужо назначаны ксёндз Кісьля.

ПА МЯСТЭЧКУ

У Малкі Шулькінай пазаўчора адбыўся вобыск. Агенты акцызнага нагляду шукалі гарэлкі: быў зроблены данос, што Шулькіна трымае патайны шынок. Знойдзена паўбутэлькі гарэлкі, пяць засмажаных тараноў, хвост, рэбры і галава ад селядца. Напісаны пратакол.

На Юр'еўскім кірмашы адбылася зацятая бойка паміж нашым панямонскім чэмпіёнам Пятрусём Маргуном і сялянамі вёскі Чыхуны. Нягледзечы на тое, што перавага была на баку чыхуноўцаў, наш чэмпіён, выхапіўшы з цялежкі шворан, разагнаў іх, і поўная перамога засталася за нашым чэмпіёнам.

Як відаць, мы ўступаем у паласу мілітарызму: народ б'ецца шворнамі, а мозг гэтага народу, інтэлігенцыя, практыкуецца ў стратэгіі на "зялёным полі".

Ва ўсякім разе, начальству варта было-б зьвярнуць увагу на чэмпіёнаў шворна і "зялёнага поля" і выдаць ім мэдалі за храбрасьць.

ТРОХІ ФАНТАСТЫКІ

Каля падножжа вапельнай гары, непадалёку ад могілак, час-ад-часу зьяўляюцца таемныя постаці маладой пары. Шмат каму з жыхароў здаралася сустракаць іх там вечарамі. Каваль Хаім быў напалоханы імі і ад страху захварэў.

Цікава адзначыць, што ў той час, калі зьяўляюцца гэтыя постаці, хворыя панямонцы ня могуць дастукацца на фэльчарскі пункт, рыцына застаецца неспажытаю, а болі і хваробы нялечанымі.

Пакуль рэдактар дачытваў і папраўляў сваю газэту, агарак сьвечкі пачынаў канаць. Белае полымя дрыгацела, хісталася, падымалася і ападала, і вось-вось, здавалася, пагасьне. Раптам з неспадзяванаю сілаю яно зноў выбухала і зараз-жа ў зьнямозе нікла, як апошні прадсьмертны ўздых.

Рэдактар паравёў вочы на агонь, пазіраў на апошнія моманты яго жыцьця. І было штось трагічнае ў гэтым змаганьні жыцьця і сьмерці. Рэдактар пазіраў і трос галавою. Не, не падняцца табе са дна жыцьця: дайшлі да канца, спустошыліся твае жыцьцёвыя сокі. Кноцік упаў на стол, агонь зусім апаў, але затрымаўся на момант, падняўся, асьвяціў яшчэ на адзін міг газэту і зьнік, як-бы заліты гэтым варожым змрокам. І цесная каморка рэдактара, і двор за акном каморкі зьліліся ў адну цёмнашэрую пляму, нямую, зацятую, не парушаную ніводным голасам жывога жыцьця.

Рэдактар адчыніў акно, абапёр лысую галаву на рукі і доўга сядзеў нярухліва, і толькі калі на ўсходзе забялелася неба, ён уздых-

нуў, зачыніў акно і лёг на сваю жорсткую пасьцель.

VIII

Зямля яшчэ песьцілася ў сонным змроку вясеньняй ночы, а неба ледзь-ледзь пачынала сьвятлець на ўсходзе зорамі, калі маладыя настаўнікі выходзілі з Панямоні. Змрок закрываў змучаныя, бледныя твары: дарога, бяссонныя ночы, згрызоты і няўдачы на "зялёным полі" адбілі на іх свае пячаці. З кампаніі сябры пашлі ціхачом, незаўважана, ні з кім не разьвітаўшыся, бо былі жорстка пабіты на ўсіх "тэфталеўскіх" пазыцыях, вышлі са строю поўнымі інвалідамі.

Спакойна, нават неспагадна сустрэлі сяброў маўклівыя панямонскія вуліцы і хаты на гэтых вуліцах, і толькі халодны пясок шуршэў пад іх нагамі няўцямнаю многазначнай гутаркай.

Некаторы час ішлі моўчкі. У іх кішэнях была пустэля, у галаве малатарня, уваччу мітусіліся розныя фігуры карт, а на душы, як кажуць, кошкі скробалі.

— А няхай яно, брат, згарыць, — азваўся нарэшце Садовіч: — Ня варта было заходзіць.

— Ну, нічога, брат, бывае і яшчэ горш, — тонам заспакаеньня адгукнуўся Лабановіч: што-ж было казаць? — Што прайшло, таго ня вернеш, і няма тут чаго каяцца. Добра ўжо і тое, што хоць пачулі смурод местачковага балота... Тфу, паскудства! Ну яго к чорту!

Відаць было, што ў Лабановіча ня так спакойна на душы, як гэта ён хацеў паказаць.

— Ты памятаеш, Стары, як нам дыктаваў калісь Корзун: "Чист кругом я, лёгок и никому не нужен". Цяпер і мы з табою такія-ж чыстыя, лёгкія і нікому непатрэбныя.

Садовіч гучна засьмяяўся. Гэты сьмех падхапілі прасторы панямонскіх выганаў, панесьлі яго пад масты і перакінулі на той бок Нёмана.

— Усё гэта яшчэ нічога, Алесь. Нашы капіталы, што перайшлі сёньня ў чужыя кішэні, не такія вялікія, каб аб іх вельмі многа гаварыць. Але справа ня ў гэтым: сьлізьнякі мы, бязвольнікі, людзі бяз цьвёрдага грунту. Вось дзе наша слабое месца! Мяне яно мучыць больш, чым паражэньне на "зялёным полі"... І вось-жа ведаеш, усьведамляеш усё гэта і тым ня меней робіш тое, ад чаго потым становішся праціўнікам сам сабе. Чаму гэта так?

— У чалавека многа такіх супярэчнасьцяў, — заўважыў Садовіч, —думаеш адно, а робіш другое. Ад гэтага і канфлікты выніказоць з самым сабою.

—Ну, а скажы, Алесь: а каб мы з табою выйгралі — так рубельчыкаў па дваццаць, якое тады было-б самапачуваньне?

— Го! — басам выгукнуў Алесь, — тады, брат, мы-б казырамі ішлі, чорт забяры! Нават каб нічога ня выйгралі і не прайгралі, і тады быў-бы іншы каленкор.

— Значыць, тут усё залежыць ад вынікаў гульні. І стала быць, калі;б шанцавала ў карты, то гуляў-бы і гуляў, і ніякага там табе ні самааналізу, ні згрызот і наогул ніякага чорта... Дык гэта, брат, ужо

швах справа!

Садовіч хацеў нешта сказаць, але ўвага яго зьвярнулася на штосьць іншае. А можа, проста гаварыць аб гэтым нехацелася. Ён раптам спыніўся, набраў духу і, моцна падаўшы наперад грудзі, загукаў старанна, разьлічана, у двух тонах, нават з замахам на некаторую музычнасьць.

— Э-э-э-вуу!

Росны луг страсянуўся вільготным паветрам, падхапіў гэтае "э-ву", панёс яго ў лес, што стаяў досыць далёка за Нёманам. Краем лесу паляцела задорыстае водгульле, прыціхла, а потым павярнула назад, бегучы другім крылом лесу, і нарэшце зусім заціхла на яго заломе.

— Хораша выходзіць! — забыўшы ўсё на сьвеце, захоплены гулкасьцю і выразнасьцю водгульля, прамовіў Садовіч і гукнуў яшчэ раз.

— А ну, давай гукнем разам!

Некалькі разоў гукнулі разам і слухалі, як разлягалася рэха і будзіла ранічны спакой маўклівых ваколіц.

— Вось дзе, брат, хараство! Прастор! А якое здаровае паветра! Ну, проста як-бы на сьвет нарадзіўся. Чуеш, як жыцьцё крыніцаю б'ецца ў кожнай тваёй жыле! — яшчэ ў большае захапленьне прыходзіў Садовіч.

Мінуўшы масты, сябры павярнулі направа. Разуліся, бо дарога забірала ў лугі, а побач яе стаяла высокая росная трава. Басаногж патрапалі далей, пахвальваючы і дарогу, і расу, і гэтую прыемнасьць ступаць босымі нагамі па мяккай дарозе, і сьвежае ранічнае паветра.

Чым далей адыходзілі яны ад Панямоні, тым спакайней рабілася ў іх на сэрцы, тым з большаю сілаю паддаваліся яны чарам дарогі і яе малюнкаў. Адзін край лугу стыкаўся з лесам, уразаўся ў яго, адхопліваючы дугаватыя лукі і павялічваючы свае травяністыя прасторы. І ўдоўж і ўпоперак луг перасякаўся вузкімі, доўгімі і глыбокімі тонямі, заросшымі аерам, сітняком, чаротамі і мяккімі ніцымі лозамі, дзе хаваліся розныя лугавыя птушкі. Срэбнаю стужкаю вывіваўся Нёман, то падыходзячы пад самы лес, падразаючы карэньне дрэвам, то бегучы сярэдзінаю лугу, то падступаючы да поля, апяразваючы бліскучым жывым паскам яго пясчаныя схілы. Сям-там па лугавых грудах раскідаліся бародкі-кудзеркі астраўкоў, дзе буяў малады сакавіты дубняк, кусты арэшніку, брызгліны, чаромхі і крушыны, а самая понізь засьцілалася мяккаю лугавою канапелькаю, што зацьвітае летам такімі прыгожымі сіненькімі кветачкамі...

Эх, як прывольныя прасторы наднямонскіх лугоў! Часамі над прасторамі зялёнага мора, як вартаўнікі, узьніmaліся пышныя постаці адзінокіх дрэў, пераважна дубоў, параскіданых дзе-ні дзе сярод лугу, а месцамі і цэлыя дубовыя гаі. Многа тут для іх прастору і сонца. Ёсьць дзе разгарнуцца іх магутным карэньням, камлям і галінам.

Між гэтых дрэў асабліва кідалася ў вочы падарожнага старадрэвіна-хвоя, што стаяла зусім адна на высокім грудзе непадалёку ад Нёмана. Тоўсты, гладкі, бы вытачаны, камель з карою накшталт адмысловай чарапіцы высока ўзьнімаў верхавіну, заламаўшы яе набок пад простым вуглом; на гэтым заломе змайстраваў сабе бусел доўгавечнае гняздо. Ад усяе адзінокае хвоі, ад гэтай пахіленай у бок лесу верхавіны павявала нейкім смуткам, як-бы ўзлажыла яна цяжар на свае плечы і схіліла пад ім галаву.

У лузе было пуста і бязлюдна. Адны толькі драчы ня ведалі супачынку і не шкадавалі горла. Адзін перад другім, схаваўшыся ў траве, дзерлі яны свае аднагучныя скрыпучыя песьні, як-бы ўвесь сэнс іх жыцьця складаўся з таго, каб перакрычаць адзін другога.

— Драч-драч! Драч-драч! — і так без канца, і так без адпачынку.

Пачынала разьвідняцца.

Прыбярэжныя кусты ўсё больш і больш вырысоўваліся, выплывалі з ранічнага змроку, сьвятлелі, развясельваліся, і шырэй разгортваліся прыгожыя краявіды, поўныя радаснага спакою і маўклівага задуменьня.

Дарога павярнула ўлева, пайшла грудамі, шчыльней тулячыся да Нёмана, дзе ён апісваў вельмі зграбную луку, падыходзячы да лесу. Уся гэтая лука выглядала пышным старасьвецкім садам, дзе замест фруктовых дрэў расьлі разложыстыя, дуплястыя з асмаленымі жараламі дубы, убраныя чорнымі шапкамі буслявых гнёздаў. Часамі гэтыя гнёзды заціснутыя ў развіліны стромкіх аголеных шпянёў, высока ўзьнятых над зялёнаю каронаю дуба, што пачынаў сохнуць зьверху, здаваліся нейкімі дзіўнымі падвескамі над дубамі, бо самыя шпяні скрадваліся адлегласьцю і губляліся ў празрыстых хвалях паветра.

Не даходзячы да лукі, выгнуўшыся яшчэ раз каля лесу вельмі прыгожаю дугою, Нёман забіраў управа, пралёгшы роўнаю, бліскучаю стужкаю паміж лугамі і полем. На адным канцы дугі стаялі кучаравыя пышныя хвоі, зьвесіўшы над вадою махрыстыя галіны і аплёўшы пясчаны бераг цэлаю сеткаю смалявых карэньняў. За імі пачыналіся маладыя сакавітыя баравіны, перамешаныя са старым лесам. Там-сям з зялёнага мора маладога хвойніку высока ўзьнімаліся парасоны-верхавіны хвой-старадрэвін, што як-бы аглядалі зялёныя прасторы свае маладое зьмены, цешачыся яе размахам і сакавітаю жыцьцёвасьцю. І гэты малады хвойнік, і гэты лес, і гэтыя хвоі зьліваліся ў адну сьцяну лесу, вырысоўваючы прыгожую вычварную лінію паваротаў, разгортваючы сваё цёмназялёнае крыло і ахватваючы пясчанае поле, дзе раскінуліся маўклівыя пагоркі. А над усім над гэтым ляжала цішыня і спакой раніцы.

— Стой, брат Алесь, — спыніўся Лабановіч, захоплены спакоем раніцы і хараством таго, што было навакола. — Ты паглядзі, што за слаўнота!

Лабановіч паказаў рукою на ўсход, дзе скрозь прорэзі далёкага лесу прасьвечваўся пазалочаны край неба, абмыты майскімі роса-

мі, і разгортваліся цэлыя панарамы ўзгоркаў.

— Эх, што за мясьціна! — пачаў ён і раптам перапыніў самога сябе. — Слухай, брат, слухай.

Над ускрайкам лесу, дзе пачыналіся жоўтыя пяскі, зазьвінела песьня ляснога жаваранка. Ён першы тут вітаў надыход дня, і песьня расплывалася ў маўклівым паветры звонам тонкага дарагога мэталу, напаўняючы яснасінія разлогі надзямельля і глыбокую цішыню зямлі, агорнутай затоена-радаснаю задумлёнасьцю. Здавалася, усё навокала занямела, зачараванае цудоўнымі тонамі песьні гэтага вольнага песьняра ўзлескаў і пясчаных пустак між лесу. Снуючыся высока ў небе, раняла птушка мяккія, ласкавыя мэлёдыі, сатканыя са звону срэбраных струн, з булькaньня лясных ручайкоў, з зумканьня пчаліных крылцаў, шолаху красак. І ўсе гэтыя тоны спляталіся так гарманічна-своеасабліва ў песьні ляснога жаваранка, што яна даходзіла да самых затоеных глыбінь сэрца і калыхала самыя тонкія струны душы.

Ніякая іншая птушка, нават праслаўлены салавей, ня можа параўнацца ў сьпевах з лясным жаваранкам. Толькі свае песьні сьпявае ён у бязлюдных мясьцінах, дзе рэдка бывае чалавек, і мала хто чуе іх. Мэлёдыя-ж сьпеваў надзвычайна багатая, рознастайная, дзівосна прыгожая і такая чоткая, такая выразная, што яе можна запісаць на ноты, а мастак-музыка, напэўна, змог-бы выканаць на скрыпцы, але афарбоўкі яе тонаў не патрапіць перадаць ніякі музычны інструмэнт.

Лабановіч стаяў і слухаў, як прычараваны, гэты смутна-радасны гымн раніцы, што нейкім дзіўным водгульлем адбіваўся ў яго сэрцы. Здавалася, што ён ужо калісь перажываў тое самае, што зьвінела цяпер у душы, толькі ніяк ня мог прыпомніць, калі гэта было. Ці гэта яму толькі сьнілася?

— З-за аднае такое раніцы варта не паспаць яшчэ адну ноч, — азваўся, нарэшце, ён і зірнуў на Садовіча, бо той ужо цягнуў яго за рукаў і некалькі разоў казаў:

— Пойдзем, брат.

І яны пайшлі.

У двух вярстах перад імі раскінулася іх роднае сяло Мікуцічы.

— Высьпімся, брат Стары, пасьля ўсіх гэтых згрызот, адпачнем, і тады будзем думаць — як і што.

— Не ўспамінай ты пра іх. Усё гэта трынь-трава. Мала што было — і гэта трэба перажыць. Для мяне ўся гэтая панямоншчына — проста як нейкі паскудны сон.

Чым бліжэй падыходзілі яны да Мікуціч, тым з большаю ўладаю апаноўвалі іх думкі і настроі свайго сяла, і кожны па-свойму перажываў іх.

— Ведаеш, брат, што: застануся я тут за настаўніка. Што ты на гэта скажаш, Стары?

— Чаму-ж табе так захацелася тут быць?

— Сваё, ведаеш, сяло, свае людзі. Буду працаваць для сваіх.

— А я на тваім месцы не застаўся-б тут, — заўважыў Лабановіч.

— Чаму?

— Ды так, — мне тут няцікава. Усё даўно табе знаёма. А я люблю пабыць на новых мясьцінах, сярод новых людзей.

— Не, брат Стары, тут і таньней пражыць можна. Будзеш сабе сталавацца ў бацькі, можна і капейку прыхаваць. І ціха, спакусы няма, а я хачу сур'ёзна ўзяцца за навуку.

— Няўжо мы, Алесь, такія бязвольныя, што гэтых спакус ня можам здолець? Бо гэта-ж ёсьць прызнаньне свайго бяссільля, раз ты баішся спакусы.

— А начорта змагацца з імі, калі гэтага можна ўнікнуць? Змаганьне, ды яшчэ з няпэўным вынікам, патрабуе траты, непатрэбнай траты энэргіі і будзе заўсёды замінаць той ці іншай рабоце над сабою. А тут, у нашых Мікуцічах, нікога няма, хто пацягне цябе на карты, на п'янства... Не, брат, гэта ідэя! А месца тут якраз звальняецца. Падам прашэньне — і квіт.

— Ну, разумеецца, і тут будзеш жыць. Усё гэта справа густу, — тонам згоды адказаў Лабановіч, бо спрачацца не хацелася. — Можа, ты і маеш рацыю. А калі ў цябе ёсьць яшчэ і ахвота жыць тут, тым лепей. Хоць мець будзем летам штаб-кватэру.

Садовіч быў хлопец гарачы, борзда захапляўся новымі мысьлямі і плянамі.

— Ведаеш, брат, сур'ёзна: давай, каб ня траціць часу, зоймемся падгатоўкаю. Да нас прыстануць яшчэ хлопцы... А то ведаеш? Зьберамося чалавек пяць-шэсьць, зложымся ды наймем яшчэ студыёзуса... Што скажаш на гэта?

— Трэба абмеркаваць, можа тваімі вуснамі прамудрасьць глаголе.

Садовіч захапіўся новаю ідэяю і ўсю рэшту дарогі гаварыў аб ёй з высокім пафасам.

IX

Не даходзячы трохі да сяла, прыяцелі разьвіталіся. Садовіч пайшоў далей адзін, а Лабановіч зьвярнуў з дарогі і накіраваўся на маленькі хутарок, што стаяў адзінока ў полі недалёка ад Нёмана. Тут жылі яго родныя.

Хутарок быў пабудаваны нядаўна на арандаванай скарбовай зямлі. Тры гады назад выгаралі Мікуцічы, і тады дзядзька Марцін надумаўся пабудавацца тут, дзе было прастарней і спакайней. За гэты час хутарок не пасьпеў яшчэ абсталявацца належным парадкам і меў досыць убогі і пустэльны выгляд, бо нават ня было ніводнага дрэўца каля хаткі, хоць ямкі для іх і пакапаў дзядзька Марцін.

Сотнямі знаёмых вачэй зірну ўхутарок на Лабановіча, зірнуў, здавалася, дакорліва, бо ён, Лабановіч, забыўся аб гэтай беднасьці аб гэтай пустэчы, заняты сабою, сваімі мысьлямі, сваім замкнута асабістым жыцьцём, хоць яшчэ летась меркавалі яны з дзядзькам Марцінам аб тым, каб завесьці тут садок, а ў садку — пчольнік. Успомніліся такія-ж звароты дадому, калі вучыўся ў сэмінарыі, і мімаволі адчуў ён, што адразу папаў у самы асяродак дамашняга

клопату, скаргі на цяжкае жыцьцё, на беднасьць. Радасьць спатканьня з роднымі астуджалася гэтымі адчуваньнямі, што былі прыглухлі за час побыту па-за межамі роднага кутка, саступіўшы месца другім. І тут нейк сама сабою ўспомнілася Панямонь і марная страта грошай, праўда, невялікіх, але ў такой бядоце яны мелі-б значную сілу. А гэта ўсё разам яшчэ больш памацняла апалы настрой маладога настаўніка.

На хутарку дзень толькі што пачынаўся. Вароты ў гумне былі адчынены і адтуль даносілася прагавіта-заядлае “хрум-хрум! хрум-хрум”. Гэта дзядзька Марцін рэзаў сечку на саматужнай сячкарні, — відаць, зьбіраўся ехаць араць папар.

Першы заўважыў Лабановіча сабака Шукай. Сарваўшыся з месца і кінуўшыся са злымі намерамі, пачаўшы сваё сабачае прывітаньне моцным гаўканьнем, якое звычайна накіроўваецца на незнаёмага чалавека, ён раптам зарваў злосны брэх, прыпыніўся на момант, каб лепей паўглядацца, завіляў хвастом і з радасным піскам кінуўся сустракаць госьця. Спатканьне з аднаго і з другога боку было самае шчырае. Шукай вішчаў, круціўся, скакаў, клаў свае лапы на грудзі Лабановіча, стараючыся лізнуць у губы, што яму, нарэшце, і ўдалося і яшчэ больш павялічыла яго сабачую радасьць.

Дзядзька Марцін кінуў рэзаць сечку і вышаў на прыгумень: па тону вішчаньня ён дагадаўся, што свой чалавек вітае на хутар. Угледзеўшы пляменьніка, якога Марцін вельмі любіў, ён засьвяціўся радасьцю і яшчэ загадзя расхіліў вусы, каб адвесьці прастарнейшае месца пацалунку, шурпатаю далоньню выцер губы і, стаўшы каля весьніц, нарыхтаваўся як належыць спаткаць госьця.

— Ну, здароў, Андрэй!

Дзядзька і пляменьнік моцна абняліся.

— На ўсё лета прыехалі? — запытаўся Марцін, зварочваючыся да пляменьніка часамі на “вы”.

— На ўсё лета... Ну, як здаровы і што ў вас добрага?

— Нічога, брат, жывем патрохі.

— Чамадан свой я пакінуў на вакзале, а сам пехатою пайшоў. Якраз з Алесем Садовічам на станцыі зьехаліся і разам дадому ішлі, — як-бы апраўдваўся Лабановіч за свой “парожні” выгляд.

Маці ў гэты час дадойвала ў хляве карову. Яна адразу была падумала, што гэта іх Андрэй прыехаў на лета, бо і сон такі прысьніўся ёй сёньня. Яна сьпяшалася як мага хутчэй дадаіць, і той час, калі дзядзька Марцін на той бок весьнічак вітаўся з пляменьнікам, вышла з даёнкаю і, прыкрыўшы яе хвартухом, борзьдзеньнка пайшла ў сенцы і зараз-жа вярнулася, каб павітацца з сынам.

— Сынок мой!.. Вярнуўся!

Лабановіч пацалаваў ёй руку.

— А я даю карову, чую — Шукай забрахаў і адразу сьціх, вішчаць пачаў. Дык мне і цюкнула, што гэта напэўна ты...

Маці з некаторымі падрабязнасьцямі апісала сваё адчуваньне, што было незадоўга перад гэтым, і нават сон расказала, ідучы ў

хату разам з дзядзькам Марцінам і Андрэем. На парозе сустрэліся з Юзікам, меншым братам Лабановіча. Юзік быў адзеты пастухом, з пугаю і торбаю. Ён ішоў выганяць у поле каровы на раніцу.

— Здароў, Юзік! — павітаўся з ім старэйшы брат.

Юзік толькі ўсьміхнуўся, павярнуўшы ў бок брата смуглы твар і паказаўшы рад белых зубоў. Нібы трохі засаромеўся.

— Выганяй, выганяй, брат, быдла, — заўважыў дзядзька Марцін. — Сонца, унь, ужо высока над лесам стаіць.

Хата была яшчэ ня прыбрана, і ўсе там паўставалі.

— У самы бярлог ты, сынок, папаў, — казала маці, як-бы просячы гэтым прабачэньня ў сына.

— Ды яшчэ-ж і рана, — азваўся Лабановіч.

— Спаць папрывыкалі доўга, — досыць строга прамовіў Марцін і кінуў погляд у той куток, дзе ляжалі ў пасьцелях яго пляменьніцы, Маня і Насьця. — Парасьпешчвала іх маці: такія, пане мой, дзявухі!

Мані было ўжо гадоў шаснаццаць, а Насьця гады на два малодшая.

— Ім-жа так хочацца паспаць, — заступілася за дачок маці. — Маладзенькія яшчэ, напрацуюцца за свой век.

Ганна, маці Лабановіча, была жанчына добрая, працавітая, руплівая, усё старалася зрабіць сама, за ўсіх заступалася. Яна ня раз плакала, будзячы Юзіка гнаць каровы, бо таму так хацелася паспаць. Хоць адну лішнюю хвілінку старалася яна прыбавіць на яго салодкі ранічны сон, а калі хлопец уставаў, стаяла пры ім, памагала сабрацца і рабіла ўсё, што толькі можна, каб улагодзіць сына.

— Змоладу трэба ў работу ўцягвацца, — стаяў на сваім Марцін, — бо як вырастуць гультаямі, то дзякуй ня скажуць табе за гэта.

Сказаўшы так, ён падышоў да пасьцелі. Накрыўшыся з галавою коўдрай, спаў самы меншы пляменьнік Якуб, найлепшы дзядзькаў прыяцель. Нахіліўся да яго дзядзька і стаў шаптаць штось на вуха. Якуб нешта буркнуў, а Марцін зарагатаў самым шчырым сьмехам, пасьля чаго сказаў:

— Якуб у мяне — чалавек. Гэта ня Юзік. Таго трэба з музыкаю падымаць, а Якуб, як слова прамовіць, падымаецца, калі трэба. Гэта — першы гаспадар у доме.

Пахвалены Якуб — яму было гадоў шэсьць — паказаў галоўку з-пад коўдры, блiснуў на брата цёмнымі вочкамі, усьміхнуўся ды зноў схаваўся.

— Мама! Ідзі сюды, — паклікаў ён матку.

Хлопцу трэба была нейкая адзежына, бо ён надумаўся ўставаць, каб апраўдаць сваю гаспадарчую рэпутацыю.

А дзядзька Марцін расказаў гэтым часам, як Якуб шукаў чарвякоў, зьбіраючыся вудзіць рыбу, адварочваў гнілякі, і калі пад імі чарвякоў ня было, сам сабе казаў:

— Тут тожа няма.

Здарэньне, здавалася-б, зусім мала выдатнае, але Марціну яно

чамусь падабалася, а гэтае "тут тожа няма" выклікала ў яго кожны раз вясёлы сьмех.

Дзядзька Марцін быў яшчэ не стары чалавек. Зранку да самага вечара ня выпускаў ён работы з рук. То на полі, то каля дому ўвіхаўся. А ў часіны больш-менш вольныя займаўся майстэрствам, што мела беспасярэдныя адносіны да спраў гаспадарскіх: то калёсы ладзіў, то саху правіў, у хляве ці ў гумне парадак рабіў, або ў хаце ці ў сенцах усякія рыштункі штукаваў. Проста што-небудзь выдумляў для большага парадку ў гаспадарстве. Кароткія перапынкі паміж работаю выкарыстоўваў Марцін для спраў рыбацкіх, балазе Нёман быў, як кажуць, пад самым бокам. А рыбацкая снасьць — сетка, нераткі, вуды — была ў яго адмысловая. У грыбныя часы, калі задажджыцца і работа спыніцца на полі, дзядзька Марцін браў каробку і хоць выхадзіць палавіну дня, затое-ж прынясе такіх баравікоў, што хоць вязі на выстаўку.

— Ну, браце, супачынь з дарогі. Я табе і палаткі ў гумне змайстраваў, — сказаў дзядзька да госьця, — а я паеду паару трохі, думаем грэчку пад Клінамі засеяць.

Дзядзька Марцін паехаў араць, а Лабановіч некаторы час сядзеў і слухаў навіны дамашняга жыцьця. Навіны-ж гэтыя нельга сказаць, каб былі вясёлыя. Наладзіць гаспадарку так цяжка. Зямля пустая, хоць і многа яе, параскідана "за сьветам", толькі тое карысьці, што з шнура каля дома. І гэты кавалак пусты, але-ж яго хоць угнаіць можна. Арэндная-ж плата падвышана, а плаціць няма з чаго. Уладзя, старэйшы брат, вось ужо тры тыдні як на плыты пайшоў. А якія заработкі — плыты? Калі прынясе дзесяць рубельчыкаў, то і добра. А колькі нагаруецца, нацярпіцца! І з пашаю цесна, забаронена ўсюды, толькі дзе ступіць жывёла, зараз і штрафы плаці. Ну, словам, чым далей, тым горай. Наогул, нейк цяжэй стала жыць на сьвеце. А тут і дзяўчаты падрастаюць, адзеньне ім трэба спраўляць.

Лабановічу цяжка было слухаць усё гэта. Ён заўважыў, што маці паблажэла за гэты час: клопату многа і жывецца нялёгка. А перад гэтым клопатам зьнікаў яго ўласны. У глыбі душы ён папікаў сябе за тое, што нічым яшчэ не дапамог дома. Праўда, і памагчы было трудна, бо пэнсыю меў невялікую, і за два апошнія месяцы ён і ня браў яшчэ яе. Тут асьвяціла яго думка — даць даручэньне знаёмаму крамніку Гэсалю, што ў Панямоні, на гэтую пэнсыю. Гэсаль з ахвотаю бярэцца за такія справы і хоць прыдзецца яму даць значны процант, затое-ж бяз клопату можна дастаць рублёў трыццаць пяць. Дваццаць рублёў ён аддасьць на гаспадарку, а рэшту пакіне сабе. На гэтай думцы Лабановіч зусім заспакоіўся і значна павесялеў. І гэта ён зробіць у бліжэйшы час. Можа, нават заўтра сходзіць да Гэсаля.

— Ты, сынок, як-бы трохі паблажэў, — заўважыла маці, прыглядаючыся да сына.

— Не, мама, гэта проста з дарогі, бо я дзьве ночы ня спаў.

— То ты, сынок, выпі сьвежанькага малачка ды ідзі засьні ў

гумне.

— Але, такі трэба трохі адпачыць.

Маці прынесла цэлы кубак малака. Якуб ужо ўстаў і пазіраў на брата.

— Ну, Якуб, дык многа назнаходзіў ты чарвей?

— Я цяпер ведаю, дзе іх трэба шукаць: на дрывотні пад трэскамі, — адказаў Якуб.

Вось калі Андрэй захоча, то ён у два мігі прынясе іх поўную бляшанку. Але рыба цяпер лепш бярэцца на аўсянікаў.

— А ведаеш, Андрэй, дзе многа рыбы?

— Ну, дзе?

— У Бервянцы. Там такая букта, што і прысам дна не дастанеш. Там можа хвоя схавацца!.. Вось там многа рыбы!

— Адкуль-жа ты ведаеш, што там яе многа?

— Я бачыў, як там яна плавае. І плюхае, страх як плюхае!

Якуб нешта ўспомніў і пачаў сьмяяцца.

— Чаго ты сьмяешся?

— Сьмешна было раз. Дзядзька вудзіў рыбу, а яна як плюхне! Я кажу: "Дзядзька, унь рыба плюхнула!" А дзядзька кажа: "Вось каб яшчэ плюхнула адна такая рыба, дык і квас быў-бы!"

— Ну, годзе табе расказваць! Няхай Андрэй адпачываць ідзе, — сказала Маня. — Я паслала ўжо табе на палатках у гумне, — зьвярнулася яна да Андрэя.

— Хадзі, я табе пакажу палаткі, — і Якуб павёў брата ў гумно. — Мы з дзядзькам майстравалі тут, — казаў, ідучы, малы. Ён увесь час круціўся каля брата і шчабятаў сваім дзіцячым галаском.

— Што-ж ты цяпер будзеш рабіць? — запытаўся Андрэй.

— Пайду зараз да дзядзькі. Дзядзька казаў, што навучыць мяне араць.

— Пойдзем, Якубка, няхай Андрэй сьпіць.

Маня паклікала гаваркога Якуба і зачыніла вароты.

Лабановіч разьдзеўся і лёг на мяккую пасьцель. Змучанае дарогаю і бяссоннымі начамі цела даўно патрабавала адпачынку, але заснуць ён адразу ня мог, бо вельмі многа было ўсялякіх уражаньняў. Нэрвы ператураміліся, а мысьлі нейк мітусіліся ў галаве і не паддаваліся ніякаму кантролю.

У гумне было досыць сьвежа і цемнавата, хоць з-пад шчыту сюды ўрываліся косы вясеньняга сонца, а праз няшчыльна зложаныя сьцены сьвяцілася яснае неба. З вясёлым шчабятаньнем залятала сюды пара ластавачак, аблюбаваўшых сабе месца для гнязьдзечка, і парушала маўклівасьць сялянскага зацішку. З поля сяды-тады даносілася пануканьне дзядзькі Марціна. Каля Нёмана — а ён быў тут зусім блізка — пачулася Якубова песьня, а потым яго-ж імправізацыя:

Нёман, Нёман дарагі,
Залатыя берагі,
Пацячы назад.

Добра Якубу! Ні згрызот, ні клопату. Вольны і шчасьлівы, як гэты ясны прамень, як сярэбраная нёмнава хваля, якою ён цяпер любуецца там.

Часамі ў гумно ўрываўся лёгкі ветрык, паварушваючы зьвіслыя са страхі нішчымныя каласкі і мастацкі сатканую павуціну на кроквах. Над страхой зазьвінела песенька палявога жаваранка... Знаёмыя, блізкія малюнкі-зьявы дамашняга побыту, родныя адгалоскі — павевы сялянскага жыцьця-клопату...

“Добра, што я дома”, — мільганула ў Лабановіча думка-адчуваньне, і ён заснуў моцным-моцным сном.

працяг будзе.

— ● —

Васіль БЫКАЎ

МЁРТВЫМ НЕ БАЛІЦЬ

Аповесьць

працяг

7

Няхутка яшчэ мы выбіраемся праз кукурузу ў чыстае поле з параскіданымі там-сям сьціртамі. Я ўслухоўваюся: аднекуль даносяцца галасы. Але гэта здалёк, і не пазнаеш нават, свае то ці немцы. У боце хлюпае ад крыві, рукі дранцьвеюць на марозе. Рукавіца засталася толькі адна, і тая, мокрая ад сьнегу, ня грэе.

Немец брыдзе ззаду, натыкаючыся на кукурузныя бадылі, часам чапляецца за іх ботам і падае. Без акуляраў ён, напэўна, зусім зрабіўся сьляпы, і я, сьцяўшы ад болю зубы, час ад часу пакрыкваю на яго. Унутры ў мяне ўсё гарыць ад стомы і зьнямогі, сьпіна мокрая ад халоднага поту, сэрца буйна трапечацца ў грудзях.

Што-ж гэта сталася? Як-жа гэта? — не магу я даўмецца. Як-жа гэта мы ўлезьлі ў такую пастку, як далі заманіць сябе ў засаду? Бедны Кротаў! Мне то шкада яго, то апаноўвае на яго злосьць. Зрэшты, я лаю сябе, камбата, старшыну Шашка. Але што цяпер зробіш?..

Танкі! Адкуль яны ўзяліся тут, і што мне, падстрэленаму, рабіць далей? Вядома, трэба як хутчэй далажыць начальству. Трэба прымаць нейкія захады, нельга дапусьціць, каб у тылах батальёнаў былі танкі. Гэта — разгром і пагібель.

Але каму скажаш? Як на зло, нідзе нікога з нашых. Хоць-бы тыя сувязісты, яны памаглі-б. Толькі сувязістаў даўно ўжо прастыў сьлед. Навокал дрымотна ляжыць шырокі абсяг стэпу, абліты яркім сьвятлом высокага месяца, перасыпаецца пад нагамі няглыбокі сьнег. Воддаль тоўпяцца засьнежаныя сьцірты. Нікому ніякае справы да нашай бяды.

Я не магу стрываць гарачнай нецярплівасьці і ўсё памыкаюся бег-

чы, каб хутчэй напаткаць людзей. Толькі нага мая ўсё болей заходзіцца болем, я дужа кульгаю, і немец на чыстым цаліку пачынае абходзіць мяне. Так мы дабрыдаем да сьціртаў, і тады я бачу непадалёк фурманкі. Глуха грукочучы коламі, яны памалу коцяцца кудысь у край сьнежнага абсягу.

— Эй! Эй! — крычу я, адразу кінуўшыся подбегам. Не, упусьціць іх мы ня можам: гэта апошняя мая магчымасьць, апошняя надзея на паратунак ад той бяды, якая навісла над батальёнам, а мо нават і над палком.

— Эй! Стой! Стой!

Пярэдняя коціць сабе, пэўна, ніхто там мяне ня чуе, а задняя, і праўда, спыняецца. Але гэта ўсё-ж далекавата, і я з усёй сілы нясьцерпна доўга кульгікаю, раскопваючы ботамі рыхлы, рассыпісты сьнег. Мне ўсё здаецца, што ездавы не дачакаецца мяне і вось-вось рушыць за першай. Ды ўсё-ж ён цярпліва выстойвае, і мы з немцам дабіраемся да дарожкі. У фурманцы некалькі чалавек, усе моўчкі і ня дужа прыязна ўзіраюцца ў нас. У мяне ад стомы захлынаецца сэрца.

— Там танкі!.. У кукурузе!.. — кажу я, падыходзячы да фурманкі. Я цяжка дыхаю, але стараюся выглядаць як мага спакайней. Толькі гэта, відаць, мне дрэнна ўдаецца.

У фурманцы маўчаць.

— Танкі! Нямецкія танкі. Разумееце? Дзе камандзір? Давайце да камандзіра! — з запальчывай рашучасьцю патрабую я, урэшце вылезшы на дарогу. І тады ў фурманцы нехта недаверліва адгукаецца жаночым голасам:

— Што, здорава цюкнула? Можа і кантузія, га?

Гэтая нічым ня прыкрытая іронія выбівае з мяне рэшткі кволага майго спакою.

— Якая кантузія? Пайшлі вы к чорту! Танкі! Разумееце, нямецкія танкі! У кукурузе!

На падводзе заварушыліся, нехта абапіраецца аб плячо ездавога і саскоквае на сьнег. Гэта, аказваецца, дзяўчына ў паўшубку і шапцы. Але яна мне не знаёмая, відаць, фурманка не нашага, а якога іншага палка.

— А ну, пакаж галаву!

— Ды не галава! Ты во нагу перавяжы! Нагу раніла! — крычу я, трацячы трываньне ад гэтага недарэчнага яе спакою.

— Нагу?

— Ага! Нагу! Ня верыш?

Я апускаюся ў сьнег. Сьцяўшы ад болю зубы, каб не завыць, зьдзіраю з параненай нагі бот. Там вельмі мокра, і я перакульваю яго халявай уніз — на сьнезе зьяўляецца цёмная пляма крыві.

Гэта, відаць, пераконвае. Дзяўчына ўскідае голаў і раптам скаланаецца.

— Пастой! А той хто?

— Немец. Ня бойся, ня ўкусіць: палонны! — раздражнёна ледзь-

ве ня крычу я. Нага нясьцерпна баліць, мокрыя пальцы хутка нямеюць ад марозу, я ўжо гатовы ўзненавідзець гэтую "памочніцу сьмерці" за яе недавер і марудлівасьць.

— Давай на воз! — кажа яна. Потым упэўнена бярэ мяне пад руку і звыкла прыкрыквае на немца: — А ну, падмагні! Чаго глядзіш, як Гітлер?

Немец нечакана разумее і з няспрытнаю далікатнасьцю падхоплівае мяне пад локаць.

— Ладна, ідзеце вы! Я сам...

На адной назе я даскокваю да воза. Там, аказваецца, ляжаць на саломе яшчэ двое параненых. Адзін ціха стогне, адкінуўшы галаву. Другі прыўзьняўся і пакутлівымі вачыма на схудзелым твары глядзіць на мяне.

— Вось тут, у куточак...

Дзяўчына з ездавым уладкоўваюць мяне ў самым задку фурманкі. Затым яна спрытна і туга перавязвае бінтамі маю прастрэленую ступню. Але тут выяўляецца новая бяда — бот на перавязаную нагу ўжо ня лезе, ды і боль такі, што няма сілы стрываць гэтае пакутнае абуваньне. Марна папакутаваўшы з хвіліну, я кідаю бот у салому. На сьнезе ля дарогі застаецца скрываўленаяануча.

— Павязло, — кажа дзяўчына. — Яшчэ-б мілімэтр і — косьць напалам.

"Косьць, косьць! — мяне раздражняе гэтае яе непатрэбнае цяпер спачуваньне і марудлівасьць. — Сам ведаю — напалам... Косьць — не жалеза..."

— Давай-жа хутчэй! — ледзьве ня енчу я. — І немца пасадзі!

— Няма куды! Хай бяжыць. Пратрасецца.

— Пратросься ўжо. Апошні. Другога ўхлопалі. І Кротава! — раптам успамінаю я, і міжвольна роспач нахлынае ў сэрца. — Эх, Кротаў, Кротаў!..

У каторы ўжо раз я не магу пагадзіцца, што так нечакана і недарэчна гіне чалавек. Проста гэтага немагчыма да канца зразумець. Толькі-ж што быў з табой побач, сварыўся, еў, ішоў. І вось яго ўжо няма... І ніколі ўжо ня будзе. Дзяўчына, месьцячыся на сваім месцы побач з ездавым, зьдзіўлена азіраецца.

— Кротаў? А што — Кротаў?

— Забілі. Што?..

— Кротава? Камандзіра роты?

— Ну.

— А ты ня брэшаш, младшой?

Яна ўпершыню насьцярожваецца, здаецца, пранікшыся маёй бядой і маёй трывогай.

— Толькі мне і не хапала брахаць з вамі. Гані ў полк! Танкі вунь за кілямэтр! — крычу я. — Ты разумееш ці не?

— А ты ня крычы! Камандзір мне знайшоўся! — злуецца дзяўчына.

Я ўмольна гляджу на яе і думаю: "Ну, ня буду, ня буду крычаць.

Толькі давай-жа хутчэй! Родненькая, міленькая, ці як там цябе назваць". Дзяўчына моўчкі, з асьцярогай пазірае ў начны стэп, нібы ўслухоўваючыся, пасьля штурхае боязна прыціхлага ездавога:

— А ну, паганяй!

І ездавы добра гоніць пару рухавых конікаў, ад якіх курыць парам, і ўсё азіраецца па баках. Фурманка то дрыжыць, рыпіць і падскоквае на гузаках няўезджанай дарогі, то сьціхае, шархотка загрузаючы коламі ў сыпкім сьнезе. Сядзець мне страшэнна нязручна, дранцьвее нага. У ране пячэ і торгае. Але і пасунуцца нельга ні на сантымэтр: я і так сяджу ледзьве ня на самых нагах параненага, які енчыць, лаецца і з азьвярэлаю ласкай просіць дзяўчыну:

— Кацярынка! Каця! Цішай! Шкурадзёр ты, а не сястра... Цішай! Ух!.. Ох, Кацюшанька!..

Каця схіляецца з перадка, адною рукой прытрымлівае яго галаву і просіць з той нязвыклай на фронце пяшчотай, якая заўжды прымушае азірнуцца:

— Міленькі, харошы мой! Ну, пацярпі! Зараз ужо. Зараз...

І тут-жа, павярнуўшы твар да немца, які зморана хакае за фурманкай, крычыць:

— Хутчэй, нямчура праклятая! Хутчэй!

Я маўчу, нічым ня выказваючы сваіх адносін да гэтых яе выкрыкаў. І мусіць таму яна вытлумачвае:

— Была-б мая ўласьць, я-б яго — бягом прагнала да Берліна і назад. На Калыму-б яго, сабаку! За нашыя мукі! Хай-бы памёрз, папакутаваў, колькі рускі народ пакутуе.

Потым з цьвёрдасьцю чалавека, які прывык, каб яго слухаліся, ціха кідае ездавому:

— Паганяй!

І тут-жа нахіляецца да параненага.

— Пацярпі ўжо. Пацярпі, міленькі!

Я і сам ледзьве трываю, нага, мала што баліць, яшчэ і дужа мерзьне пад палой шыняля. Толькі як-небудзь трэба датрываць да сяла. Там штабы, камандзіры, яны што-небудзь прыдумаюць.

8

Сяло паказваецца нечакана. На месячнай бялізьне пад гарою — доўгі раскіданы рад белых мазанак. Ля іх загародкі з плятнёў, шэрае гольле вішаньніку на ўзмежках, сям-там мірны пробліск акенцаў, гуркатаньне машын і галасы. У вёсцы свае. Праўда, мяне крыху зьдзіўляе такая мірная ідылія пад носам у немцаў. Але-ж гэта тылы. Палкі, відаць, наступаюць няблага, наперадзе танкі, артылерыя: чаго тут баяцца?

Дарога коціцца ўніз, тарахціць, грукоча фурманка, у Бога Хрыста і маць лаецца паранены. Нават другі, спакайнейшы, і той прыўзьнімаецца на локці з-пад шыняля, і на яго белым, ненатуральна зашчаціненым твары адбіваецца грымаса пакут. Каця на перадку заікастым ад дрыготкі голасам супакойвае:

— Счас, счас, родненькія... Счас...

Мы спускаемся па адхону і, крыху цішэй праехаўшы кароценькую, абсаджаную вербамі грэблю, зварочваем у вуліцу. Аднак па вуліцы не праедзеш: наперадзе, даўжэзным кузавам перагарадзіўшы дарогу, гурчыць здаравенны "студабэкер". Шафёр, прыадчыніўшы дзьверцы, напалову высоўваецца з кабіны і памалу здае назад. Ля плоту сьпіной да нас завіхаецца, нехта ў паўшубку і асіплым знэрваваным голасам камандуе:

— Лева руля! Лева! Яшчэ лева! Давай, давай!..

"Студабэкер" сунецца ў занадта вузкія для яго вароты, цяжкімі апонамі ўмінае сьнег, і раптам абмазаны глінай пляцень з хрустам кладзецца долу. Чалавек у паўкажушку ўскідвае кулакі.

— Куды даеш?! Куды даеш, сабачы сын! Дзе ў цябе вочы? Дзе вочы ў цябе, пытаюся?

Ён ад злосьці падскоквае да кабіны, здаецца, вось-вось накінецца на шафёра. Але ня кідаецца, і шафёр, на дзіва спакойна для такой сытуацыі, басам адказвае:

— У лобе вочы, таварыш капітан.

— У лобе? — зьдзіўляецца капітан. — Хіба яны ў цябе ў лобе? Давай наперад!

— Стой! — кажу я, пад'ехаўшы.

Ездавы прытрымлівае коней. Каця саскоквае з перадка.

— Таварыш капітан!

Капітан ня чуе, ці ня хоча чуць. Адступіўшы на крок, ён зноў камандуе шафёру:

— Упярод і права руля! Яшчэ, яшчэ права! Давай, давай!

— Капітан! У стэпе танкі! Каму далажыць?

Каця ўшчыльную падыходзіць да камандзіра. Я злажу з падводы і на адной назе таксама скачу да яго.

— Таварыш капітан! Там нямецкія танкі! — спадзяюся я зьбянтэжыць яго гэтым паведамленьнем. Але капітан быццам і ня чуе.

— Права! Яшчэ права! Так, так! — капітан прысядае, зазіраючы пад кузаў машыны. "Студабэкер", вуркочучы, пачынае ўязджаць у двор.

— Што? Танкі? Многа? — і адразу-ж да шафёра: — Давай, давай! Прайшло! — з палёгкай аб'яўляе ён і толькі тады нібы ўпершыню заўважае мяне з Кацяй.

— Танкі нямецкія! Вы чуеце? — крычыць Каця. — Вось турнуць, будзе вам тады "давай, давай".

— Што? — зьдзіўляецца капітан, і асіплы голас яго зноў робіцца сварлівы. — А што вы мне крычыцё! Я што — ІПТД *). Ідзіце ў артполк і дакладвайце. Мне загадана, я ДОП **) разгружаю.

Ён разгружае ДОП! Гэтая яго нязрушнасьць пачынае бянтэжыць мяне. Я імкнуся растлумачыць капітану, што навісла над яго ДОПам, але Каця меней цырымоніцца і апярэджвае мяне:

---

*) Зьнішчальна-супрацьтанкавы дывізіён.

**) Дывізіённы абменны пункт.

— Які к чорту ДОП! Вось яны як урэжуць да ранку — будзе тады і ДОП і поп.

— Таварыш капітан!

Каця махае рукой.

— Ды ну яго, младшой!

Яна ўскоквае ў перадок, я ўвальваюся ў фурманку. Ездавы агравае коней і, аб'ехаўшы "студабэкеры", мы імчым па начной вуліцы. А ў сяле так па-вячэрняму ўтульна і мірна, што мне аж робіцца страшна. Я ўжо прадбачу, чым можа скончыцца такая ідылія. Не, што-б там ні стала, трэба знайсьці камандзіраў ці штаб.

У адным двары, дбайна прыціснуты да сьцяны, стаіць "віліс", ля якога моўчкі поркаюцца двое, — мусіць, зьнімаюць сваё майно. Дзе "віліс", там заўжды начальства, і таму, згледзеўшы машыну, Каця адразу спыняе фурманку.

— Сядзі, младшой. Я сама.

Я застаюся ў возе, а яна бяжыць у двор і нешта тлумачыць тым двум. Неўзабаве яны ўсе выходзяць на вуліцу і ідуць да фурманкі.

— Вось младшы лейтэнант наткнуўся... Камандзіра роты забілі, — кажа дзяўчына і змаўкае, з надзеяй пазіраючы на чалавека.

Я таксама ўзіраюся ў яго, — гэта мажны, падпяразаны па шынялю мужчына, на плячах шырокія з двума прасьветлінамі пагоны. Іншых знакаў там ня відаць, але ён у вушанцы: маёр або падпалкоўнік.

— Вы дзе бачылі танкі? — спакойна зьвяртаецца ён да мяне.

— У стэпе, таварыш падпалкоўнік. — (На ўсякі выпадак я бяру большае з магчымага, за гэта ня крыўдзяцца). — Кілямэтры праз тры адсюль. Штук з дванаццаць стаяць ствaламі сюды.

— Вы думаеце, гэта нямецкія?

— Нямецкія, — кажу я. — Нас абстралялі. Камандзіра роты забілі. Мы вось ледзьве ўцяклі з палонным.

Падпалкоўнік моўчкі азірае мяне, потым немца, які сьціпла стаіць ля фурманкі і трасецца ад сьцюжы.

— Так. Добра. Можаце ехаць, — памеркаваўшы, кажа камандзір.

Ля яго моўчкі чакае другі, у целагрэйцы — мусіць шафёр або ардынарац. Мала што разумеючы з гэтага дазволу, я пытаюся:

— А куды палоннага здаць?

— Палоннага ў Іванаўку. Згодна з распараджэньнем камандуючага, зборны пункт для палонных у Іванаўцы.

— Дык тут усе параненыя, — кажа Каця. — Вазьміце вы немца.

— Не, адпраўляйце ў Іванаўку, — спакойна, але з няўхільнай цьвёрдасьцю кажа камандзір. — І, дарэчы, паведаміце там пра танкі. Скажыце, падпалкоўнік Стах паслаў, — нечакана загадвае ён.

Вось табе і раз! Мы — ім, а яны нам. Дамовіліся! Атрымалі загад! Падпалкоўнік з тым, што ў целагрэйцы, адыходзяць з дарогі пад сьцяну хаты і закурваюць. Мы стаім на месцы і зьбянтэжана пазіраем на іх. Чутна, як той, другі, сьцішана прапануе начальніку:

— Мусіць, трэба змывацца... Ну іх к д'яблу, гэтыя танкі...

Я ня чую, што адказвае падпалкоўнік. Хутка яны ўдвух хаваюцца ў двары, і тады я лаюся. Нешта ва мне надрываецца. Вытрымка мая на тым скончылася, я гатовы абурацца і крычаць — што-ж гэта робіцца? На возе стогнуць параненыя. Каця таксама злуецца:

— Тылавікі праклятыя! Канцэнтратаў аб'еліся — не праб'еш! Хоць каравул крычы!

— Паганяй! — крычу я на ездавога. — Паганяй!

Ездавы зноў паганяе. Мяне ахоплівае нецярплівасьць — чорт з імі, паедзем у Іванаўку! Толькі дзе яна, гэтая Іванаўка? Як яе знойдзеш уначы, і колькі на тое спатрэбіцца часу! А тут яшчэ два небаракі ў падводзе!.. І немец, што трухае ззаду. І мая мокрая ад крыві нага, якая ўжо задубела і нема баліць ад раны і марозу...

На завароце вуліцы мы ледзьве ня зьбіваем з ног некалькі салдатаў. Ратуючыся ад коней, яны, лаючыся, ускокваюць на прызбу хаціны. Адзін нехта прыціскаецца да плота, і па ладнай цыгейкавай шапцы на галаве, а найбольш па сумцы ля боку, я пазнаю ў ім камандзіра. Раптоўная надзея ўспыхвае ва мне. Я хачу спыніць фурманку, але яна спыняецца сама — гэта ён у злосьці хапае за цуглі коней і завяртае фурманку ўпоперак вуліцы.

— Стой!

Голас яго злы, уладарна-нецярплівы, здаецца, зусім недарэчы такая сустрэча. Але цяпер гэта мяне мала засмучае: што там далікатнасьць, калі ў тылы прарваліся танкі! Я хачу крычаць яму пра іх, ды ён апярэджвае мяне:

— Хто такія? Чыя павозка?

— Ды параненыя! Ня бачыце хіба? З батальёна Шароніна, — адказвае Каця.

— Таварыш камандзір, — кажу я. — Трэба як перадаць у штаб у разьведаддзел... Камдзіву. У стэпе недалёка танкі. Нямецкая засада.

Камандзір усё гэта зацята выслухоўвае, падыходзіць да павозкі, зазірае ў яе і, нібы ня чуючы маіх слоў, тонам, які не дапускае пярэчаньня, загадвае:

— Зьлезьці ўсім!

— Ды вы што? — усхопліваецца на перадку Каця. — Вы што: тут цяжка параненыя!..

— Санінструктар, так? Ка мне, санінструктар! Вы, паранены, таксама! — ня прымаючы пад увагу пярэчаньні, ківае ён на мяне.

Аднекуль ля яго зьяўляецца аўтаматчык, цяпер іх ужо двое. Камандзір стаіць за два крокі ад мяне, грозны і няўмольны, як генерал. Я ўзіраюся ў яго плечы, імкнучыся вызначыць званьне, але там нічога не зразумееш. Угары зьзяе месяц, і мне ня відаць яго твару, зацененага шапкай. Але я ўгадваю, што твар гэты не абяцае дабра.

— Паўтараю: саніструктар, вы — з забінтаванай галавой, павозачны і вы, — ківае ён у бок немца, — хадземце за мной.

Нічога ня зробіш. Каця першай саскоквае з перадка. Неахвотна пакідае сваё месца ездавы. Трымаючыся за рабрыны фурманкі, зла-

жу я. Камандзір ступае наперад.

— Марш у памяшканьне!

Я думаю, што гэта бязглуздзіца — ня болей. Куды ён нас павядзе, і што мы яму тут зрабілі? І я хачу вытлумачыць:

— Вы разумееце: танкі. Мы сьпяшаліся далажыць. Праз якую гадзіну яны могуць быць тут.

Камандзір азіраецца.

— І папрашу памаўчаць. Пакуль вас ня пытаюць...

— Ну, пайшлі, падумаеш! — са злоснай рашучасьцю кажа Каця і ідзе ў двор. За ёю валачэцца ездавы, пасьля немец. Я, трымаючыся за плот, на адной назе скачу сьледам. Ля фурманкі з двума паранемымі застаецца аўтаматчык.

Камандзір вядзе ўсіх цераз двор, потым у цёмныя сенцы і расчыняе дзьверы ў хату. На вушаку цьмяна гарыць газьнічка, вокны завешаны нейкім рызьзём. Некалькі малых палахліва кідаецца на печ, і неўзабаве з-за коміна зьяўляюцца іх баязьлівыя і цікаўныя тварыкі.

— Прашу дакумэнты! — кажа начальнік, падыходзячы да газьнічкі. Я ўзіраюся ў ягоныя плечы — вось табе і на! Толькі капітан, а паставіўся быццам генерал — ня меней... Столькі зацятае напускной строгасьці!

— Пажалста! — з гатоўнасьцю, але і са стоеным выклікам кажа Каця і лезе за пазуху.

Стрымліваючы пры сабе недарэчны тут гнеў, я намацваю пад шынялём нагрудную кішэню і дастаю сваё пасьведчаньне. Ездавы наш, даволі пажылы, сялянскага аблічча дзядзька, нетаропка распяразваецца і доўга корпаецца, пакуль знаходзіць у нетрах свае вопраткі старанна агорнутую паперай чырвонаармейскую кніжку. Хвіліну капітан моўчкі вывучае нашыя дакумэнты. На ягоным чарнявым твары — суцэльная строгасьць службіста. Урэшце ён узьнімае твар, абводзіць нас пільным прыдзірлівым позіркам і спыняецца на чацьвёртым — немцу.

— А вы што?

— Гэта немец, — кажу я. — Мы яго на зборны пункт вядзем. У Іванаўку.

Я думаю, што ён зараз-жа прычэпіцца да мяне і палоннага, дакумэнтаў на якога ў мяне ніякіх няма, а ягоныя засталіся ў батальёне. Мусіць, у тым я вінаваты. Аднак хто думаў, што маё канваірства павернецца такім чынам! Але капітан, здаецца, ня мае намеру лішне чапляцца да палоннага і складвае ў адно нашы паперы.

— Дзе вы бачылі танкі? — пытаецца ён у мяне, змрочна стоячы пад самай газьнічкай. Рукі ён выразным жэстам утырквае ў кішэні шыняля.

— У кукурузе. Праз тры кілямэтры адсюль.

— Каму вы аб тым далажылі?

— Ды тут даложыш!.. — запальчыва апярэджвае мяне Каця. — Тут у вас усе як пыльным мехам аглушаныя.

Яна так вольна і незалежна трымае сябе перад гэтым прыдзірам-капітанам, быццам ён зусім ніякі і не начальнік. Я, на жаль, так не магу і сьціпла стаю, прыхінуўшыся да лаўкі і падкурчыўшы сваю прастрэленую нагу.

— Двум чалавекам дакладвалі, — кажу я. — Капітану з ДОПа і аднаму падпалкоўніку.

— Дык вось зарубіце сабе на носе, — строга кажа капітан. — Больш каб ні слова! Зразумелі? А то — паніку мне разьвязьлі! Як у сорак першым. Я вам пакажу танкі! — заканчвае ён недарэчнай пагрозай.

— Пры чым тут паніка! — сварліва кажа Каця. — Мы дакладваем. Што мы на ўсю вуліцу крычым, ці што? Ды тут у вас хоць галасі — нікога ня пройме...

Капітан выслухоўвае яе словы і пакідае іх без аніякай увагі. Зьвяртаецца да мяне аднаго:

— Вы панялі, младшы лейтэнант? А цяпер марш адсюль! — змрочна загадвае ён і крыху мякчэй дадае: — У трэцяй ад царквы хаце збор раненых.

Ён аддае нашыя кніжкі і апускае рукі па швах.

— А палоннага? — пытаюся я. — Вазьміце ў нас палоннага. У мяне во, нага...

— Я не канваір! — адказвае капітан. Я разгублена стаю, пачынаючы разумець, што і ад гэтага болей не даб'ешся нічога.

Памаўчаўшы, мы нерашуча паварочваемся да парога і праз цёмныя сенцы, мацаючы сьцюдзёныя сьцены, выбіраемся на двор. Марозны сьнег парыпвае пад нагамі.

— Ну і чорт з ім! Паехалі! Пра тых трэба падумаць. А то загнуцца, чаго добрага, — кажа Каця і накіроўваецца да фурманкі.

9

Што рабіць далей — хто яго ведае? Мусіць, трэба-б перш прытушыць сваю гарачнасьць, астыць нутром, супакоіцца ці зьмірыцца з тым, што адбылося. Зноў-жа нейкага клопату патрабуе мая зусім акачанелая нага, стогнуць на возе параненыя, валачэцца гэты палонны... Ды і што я яшчэ магу зрабіць у такім маім стане — ці ня хопіць ужо дакладваць, ці ня праз меру такая мая ўстрывожанасьць? Яшчэ сапраўды палічаць за панікёра ды арыштуюць. Няўжо-ж тыя камандзіры, з якімі я сустракаўся, ня зробяць чаго? Усё-ж, тут ёсьць, мабыць, якая сувязь, паведамяць, каму трэба: прымуць якія захады супраць гэтых танкаў. Ня можа-ж таго быць, каб такая акалічнасьць нікога ня ўстрывожыла. А можа камандаваньне ўжо ведае пра ўсё гэта? Мо так і было прадугледжана ў плане апэрацыі? Тады дарма я гэтак непакоюся, распінаюся, нібы які панікёр. Тады, мусіць, трэба перш-наперш перавязацца як мае быць, ды абагрэцца, ды збыць куды гэтага немца. Толькі куды яго дзенеш?

Хата, дзе разьмясьцілася санчасьць, сустракае нас прыветлівым агеньчыкам у двух вокнах (трэцяе, выбітае, заткнута ахапкам саломы) і з песьняй. Нехта ва ўсё сваё асіплае горла натужна крычыць

пад ня дужа суладны басавіты гул некалькіх струн гітары:

Шаланды, полные кефали,
В Одессу Костя привозил,
И все биндюжники вставали,
Когда в пивную он входил.

Знака або флажка на хаце ніякага няма. Па двары таксама нельга пазнаць, што тут санітарная часьць. Але, як казаў капітан, гэта трэцяя хата ад царкоўкі, што зводдаль сьціпла шарэе беленымі сьценамі, і Каця спыняе коней. Ездавы саскоквае на сьнег, злазіць з перадка Каця. Я таксама выкульваюся з фурманкі, ківаю немцу "Ком!" і на адной назе скачу да расчыненых у сенцы дзьвярэй. Палонны баязьліва ідзе побач. Каця намацвае ў сенцах клямку.

Песьня адразу абрываецца. У куце і на прыпечку ліхаманкава трапечуцца агеньчыкі дзьвюх "кацюш". Угары варочаецца пласт дыму, і ў кутках — непераможаны капцілкамі змрок. Рэзкі пах сьвежых бінтоў, крыві і пракіслы дух шынялёў шыбаюць у нос, даючы тым упэўніцца, што хатаю мы не памыліліся.

— Братва, рама! Ва ўкрыціе! — пасьля сэкунднае паўзы ў фальшывай трывозе выкрыквае чыйсьці голас.

Сьледам за Кацяй я прапускаю немца і пераскокваю парог. Першым на вочы трапляе, пэўна, той самы гітарыст. Выцягнуўшы на ложку ля парога абкручаную бінтамі нагу, ён замірае з гітарай у руках і, заблішчаўшы свавольнымі вачыма, упіраецца позіркам у Кацю. У кутку на саломе сядзяць яшчэ параненыя. Нехта ледзьве ня да пояса спавіты бінтамі — і грудзі, і галава, і твар — мусіць абгарэлы.

— Дурны! — кідае Каця да гітарыста. — Чаго галёкаеш? А ну, устаць! Хто старшы?

Гітарыст, ня выпускаючы гітары і ня зрушваючы з месца параненай нагі, усім целам паварочваецца да Каці. Пад накінутай на плечы курткай дэсантніка ціхенька бразгаюць медалі. На століі замірае вялікі зламаны цень.

— Адставіцьі Ужо наўставаліся! Цяпер усё! Кропка! Амба!

— Хто старшы, пытаюся?

— Старшы? Быў ды ўвесь выйшаў. Да начальства. Хош — буду я?

— Абыдземся без такога. А ну, злазь! — Каця бесцырымонна тузае яго рукаў. Куртка спаўзае — на пагонах сержанцкія нашыўкі. — Тут цяжолых паложым. Дзе санітары?

— Стоп, рыжая! Не чапай! Я кантужаны! — з блазенскім выглядам паясьнічае гітарыст і, зьмяніўшы тон, з сілаю б'е па стунах. — Санітары! Гэй, санітары!

Аднекуль з-за перагародкі, адхінуўшы пасьцілку, выходзяць двое ў непадпяразаных шынялях. Адзін высокі і худы, другі нізенькі — абое пажылыя, рахманыя, відаць, нядаўна мабілізаваныя дзядзькі.

— Цяжолых унесьці! Ды жыва! Давай насілкі!

— Унесьці! — відаць, ужо адчуваючы сябе начальствам, загадвае

гітарыст і тыцкае ў санітараў пальцам. — Ты і ты! Гэты іхні паможа, — паказвае ён на палоннага і раптам зьбянтэжана міргае вачыма. — Ого, Гансік! Братва, Гансік! Яй Богу! Айн, цвай — бітэрфляй... Ком!

З куткоў усе паварочваюцца да парога. Аббінтаваны ненатуральна выпростваецца, нагамі скідае з сябе паўшубак і выкідвае наперад рукі, таксама заматаныя па локці бінтамі.

— Немец? Зараз-жа кокнуць! Кокнуць к чортавай матары! — надрывам выкрыквае ён. Другі, што ляжыць побач, штось прыгаворваючы, ахінае яго паўшубкам. Сержант хуценька саскаквае з ложка і, несучы перад сабой прамую і тоўстую, як бервяно, нагу, падступае да немца.

— А ну, спакойна! Гэта палонны.

— Ну, канешне, спакойна. Навошта сьпяшацца. Пасьпеем! — з нядобраю крывой ухмылкай кажа сержант і са знарочыстай спаважнасьцю бярэ немца за канцы адкладнога каўняра. — Ён-жа добры. Ён-жа сазнацельны. Гітлер капут? — хуценька пытаецца ён.

— Гітлер капут, — ня дужа ўпэўнена, але з гатоўнасьцю згаджаецца немец. Вусны ў яго, аднак, прыкметна падрыгваюць. Сержант, усё з той-жа ўхмылкай на твары паварочваецца да астатніх.

— Ось бачыце! Ён добры. Знайшоў учора нашу афішку, што перад наступленьнем кідалі, прачытаў і перавыхаваўся. Люблю перавыхаваных гансічкаў. Трафейчыкі, канешне, усе выпатрашылі. Ур няма? — міралюбіва пытаецца сержант і спрактыкавана лапае немца па пустых, ужо абвіслых кішэнях мундзіра. — Ну, канешне, у кармане вош на аркане...

Сержант гарэзна тузае за доўгі казырок немцаву шапку, якая туга ўзлязае таму на вочы, і ідзе назад да ложка. Немец бяскрыўдна папраўляе шапку, а я пераходжу ад парога і апускаюся пад сьцяну на край саломы. Болей сесьці тут няма дзе. На адзіным услоне ў прасьценку нехта ляжыць, ложак займуць цяжка параненыя. Гітарыст ускладвае нагу на край ложка і бярэ гітару.

— Я так думаю, — кажа ён да мяне, бязладна затрэнькаўшы струнамі. — Які сэнс немцу ваяваць з намі? Ну што карысьці: уварвецца калі ў траншэі, што ён знойдзе? Хвігу. Хіба што анучу брудную на брустверы. А ў іх! Ого! Колькі ў іх барахла рознага застаецца. Я дык калі загад “Упярод”, ляту, як скажэнны. А што? Спадзяешся на трафейчыкі! Схопіш, а ў іх вошай багата, халера!

З расчыненых дзьвярэй шугаюць воблакі сьцюжы — санітары ўносяць параненых. Каця ўкладвае абодвух на ложак, укрывае дзіравым шынялём.

— Паляжыце да заўтра. Уранку ў шпіталь адпраўка. Доктар сказаў.

Адзін з іх, пэўна, ужо даходзіць — вочы напаўзакрытыя, нос завастрыўся, з апалых грудзей ірвецца трудны пузырысты хрып. Другі перарывіста стогне, дужаецца з пакутамі і, павярнуўшы на бок галаву, абыякава азірае людзей.

— Браток, скруці пацягнуць, — кажа ён да сержанта. — У кішэні там, браток... І папера...

Сержант з гатоўнасьцю адкладвае гітару.

— Калі ласка, ацец. Гэта магём. Пакуль рукі цэлыя. Адкуль будзеш, землячок?

— Варонежскі я.

Паранены робіць рух сківіцамі, нібы глытае сьліну. Позірк яго неспакойна блукае па цёмнай столі хаты.

— Ну, дык саўсем землякі... Што Варонеж, што Растоў — адна Расея. На, пацягні, палягчэе, — з добрасьцю запэўнівае ён і пытаецца: — Пяхота?

— Пяхота, — выдыхае зацяжку паранены і засьмяглымі вуснамі зноў ловіць цыгарку.

Немец няёмка топчацца ля печы, няведаючы, дзе прыткнуцца. Паводзіць ён сябе зважліва, трошкі баязьліва. Я адчуваю гэта і клічу яго да сябе:

— Ком! Ідзі сюды. І сядай. Нечага тырчаць.

Ён разумее і, падабраўшы доўгія ногі, няўклюдна сядае побач на земляной падлозе. Вочы яго трывожна сьлізгаюць па мне, па сержанту і спыняюцца на ягонай гітары. Каця ля прыпечка пры цьмяным сьвятле "кацюшы" корпаецца ў мэдыцынскай сумцы — рыхтуе лякарства. Сержант з сілай шчыпае басовую струну і няўлад, фальшыва пачыне запеў салдацкае песьні:

Первая болванка попала в бензобак...

— А ну, спыні сваю трэнькаўку! — строга кідае ад прыпечка Каця.

Нехта з кутка дабрадушна пярэчыць:

— Хай іграе. Можа боль трохі заглушыць.

Сержант энэргічна перакашліваецца, зьбіраючыся засьпяваць, калі ня лепш, дык ва ўсякім разе гучней.

Первая болванка попала в бензобак,
Вылез я из танка сам не знаю как... —

зноў фальшыва пачынае ён, відаць, разумее гэта і, сустрэўшыся з позіркам немца, са злосьцю абрывае запеў.

— Чаго бельмы вылупіў, фрыц? Не падабаецца? Хіба лепей можаш? Што ты наогул можаш, фрыцаўская морда?

— Нэмножько, — раптам выразна вымаўляе немец і працягвае руку да гітары. Сержант, набычыўшы голаў, з паўхвіліны амаль з лютай зьбянтэжанасьцю глядзіць на яго. Нібы вырашаючы, ці варта ўсур'ёз прымаць яго просьбу.

— А ну, а ну! Ізабразі-ка... Паглядзім, што ты ўмееш. Ну! Давай! Дуй! — нечакана вырашае ён і аддае гітару.

Немец далікатна бярэ яе, уладкоўвае на каленях і, ціхенька перабіраючы струны, левай рукой падкручвае шурупы. У куце зноў усхапляецца абвязаны. Ён нічога ня бачыць і праз ледзьве стрываны боль крычыць з роспаччу ў голасе:

— Ага, фрыц? Гэта фрыц? Чаму вы яго не заб'яце? Забіце фрыца!

Той, другі, ягоны сусед, прыпаднімаецца і лёгенька, бы малога, кладзе яго на сьпіну.

— Ладна, ціха... Я яго сам. Вы пачакайце...

Вочы гэтага чалавека з-пад насупленых броваў пры няпэўным сьвятле "кацюшы" нядобра бліскаюць у бок немца. Абгарэлы корчыцца ў пакутах, енчыць, сьцяўшы зубы. У хаце, аднак, на яго не зьвяртаюць увагі.

Немец нясьпешна настройвае гітару. Мы ўсе з затоенай цікаўнасьцю глядзім на яго — усё-ж ня часта бачыш, як фашыст упраўляецца з музыкай. Цікава, што ў яго атрымаецца! У сержанта на вузкалобым твары ўжо ня хцівая ўсьмешка, а прытоеная да часу пагроза. Мне здаецца, калі немец у чымсь не дагодзіць, то яму ўжо ня спусьцяць — прыйдзецца тады бараніць. Цяжкапаранены на ложку павяртае на бок свой зьбялелы твар і з пакутніцкай нятутэйшасьцю ў паўзаплюшчаных вачах таксама сочыць за немцам. Усё-ж ён чакае чагось, і гэтае чаканьне на кароценькую хвіліну нібы прытупляе ягоныя пакуты. З дзявочаю цікаўнасьцю коратка азіраецца ад прыпечка Каця і хмурыцца. Чамусьці я пачынаю хацець, каб немец сапраўды сыграў што няблага. Міжвольна мне ўжо карціць на спачуваньне да яго ў гэтай хаціне. Усё-ж ён "мой" немец.

І сапраўды, ён хутка падстройвае гітару і трошкі сьцішна, але лёгка і спрытна пачынае бегаць па струнах. Просьценькі, усім вядомы матыўчык, як тоненькі сакавіцкі ручаёк, журчыць у хаціне:

Синенький скромный платочек
Падал с опущенных плеч...

Вось дык дзіва! Вось табе і немец! Грае наша, рускае, як самы заўзяты русак. І параненыя, глядзі ты, пасьціхалі ўсе, ніводзін ня вякне ні слова — слухаюць. Сержант з самага пачатку, відаць, страчвае свой пагрозьлівы намер. Нехта ў куце сьцішна ўздыхае, пасьля ўсхліпвае — ага, плача! Гэта, здаецца, абпалены. Ну, але што-ж зробіш! Што мы ўсе тут, у гэтай хаце, можам зрабіць, апроч як трываць свой боль. Хто большы, хто меншы, хто на дзень-два, хто на доўгія месяцы. Апёкі-ж будуць балець да самага канца, пакуль не зажывуць — няма горшага болю чым ад апёкаў. Цяпер нам адно — трэба звыкацца з болем, думаю я. Там, у стэпе за Кіраваградам, наступаюць, акружаюць, адбіваюць атакі, вызваляюць сёлы і станцыі, а мы тут — суцэльная канцэнтрацыя болю. Як толькі дагэтуль не дадумаліся выкарыстоўваць яго энэргію, акумуліраваць, кансэрваваць, ператвараць у іншыя віды? Колькі яе, нечалавечай і пакутнай, прападае бяссьледна ў гэтай вайне! На жаль, цяпер, як і тысячы год на зямлі, пакуты — асабістая справа кожнага, бескарысная трата вялізных людскіх намаганьняў. Таму плач баец, не саромся. Кажуць, ад плачу стане лягчэй! І не чапляйцеся да немца. Чорт з ім, хай жыве, усё-ж і ён — чалавек. Вунь як іграе...

Немец тым часам канчае іграць. Сержант зьбянтэжана падаецца назад, ямчэй умошчваецца на ложку ў нагах параненага і ссоўвае на лоб пакамечаную, з растапыранымі вушамі шапку.

— Здарава, шэльма! Нічога ня скажаш!

— Добра шпарыць... — стрымана адабраюць у куце. — А ну яшчэ што!

Немец лёгенька кранае пальцамі струны, пробуючы іх гучаньне. Сержант падабрэлымі вачыма разглядае яго зьверху. Відаць па ўсім, гэтаю ігрой немец пахіснуў у ім прывычную грубаватую самаўпэўненасьць і абудзіў пачуцьцё звычайнай чалавечай цікавасьці.

— Ты хто? Фашыст? — пытаецца ён, ва ўпор узіраючыся ў немца. — За Гітлера?

— Гітлер капут! Гітлер плёхо, — хуценька адказвае немец сваёю прывычнай фразай.

Я пазіраю на яго і адчуваю, як нешта ў ім перамянілася, быццам ажывела. Позірк набывае натуральнасьць і перастае палахліва бегаць па тварах. Сьцішаная ўвага людзей супакойвае яго.

— Во гэта я разумею, — кажа сержант і бесцырымонна але без пагрозы ляпае яго па плячы. — Што, сам здаўся? Сам плен ком?

— Я, я. Сам, — пацьвярджае немец.

— Правільна. Адабраю. Дай пяць. — Сержант коратка ціскае за локаць яго занятую гітарай руку і ўжо зусім дружалюбна прапануе: — А ну ізабразі яшчэ што! Ну вось гэту: “На позицию девушка провожала бойца...”

— Огоньёк! — здагадваецца немец і хуткім гарлавым прабегам бяз слоў заканчвае мэлёдыю. Задаволены яго здагадлівасьцю, сержант адабрае:

— Во, во!

Неўзабаве немец зусім няблага іграе “Огонёк”, і я толькі дзіўлюся ягонай здатнасьці да рускіх песень. Сержант хрыпата падпявае, а мяне горне ў салодкі, млявы, ліпучы сон. Я адчуваю: ня трэба паддавацца яму, нельга, ці мала што... Трывога ў душы нейкі час змагаецца са сном, але неўзабаве, здаецца, ён усё-ж адужвае ўсё — і клопат, і трывогу, і мой боль у назе...

працяг будзе

Пятрусь БРОЎКА

*

Усё жыцьцё — адно імгненьне.
Зацьвіў... Час прыйдзе адцьвісьці...
За пакаленьнем — пакаленьне.
Усё мяняецца ў жыцьці.
Ідзе наперад маладое.
Ня мае сьвет яму граніц.
Прыносіць новае, такое,
Што сэрца зайздрасьцю шчыміць.
Ах, колькі, колькі іх, шчасьлівых,
Дапытных, юных навакол!..
Мы ж — каласамі сьпелай нівы
Глядзім задумліва на дол.

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ

БЕЛАРУСКАЯ ПЕСЬНЯ

Дзе мой край? Там, дзе вечную песьню пяе Белавежа,
Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў,
Дзе на ўзвышшах Наваградскіх дрэмлюць суровыя вежы
І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро.
Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць ласкава віецца,
Дзе Сафія плыве над Дзьвіною, нібы карабель...
Там, дзе сэрца маё з першым крокам, як молат, заб'ецца,
Калі б нават сьляпым і глухім я прыйшоў да цябе.
Што сьляпым? Нават мёртвым успомню высокія зоры,
Над ракою чырвонай і цьмянай палёт кажаноў,
Белы ветразь на сініх, на гордых, як мора, азёрах,
І бары-акіяны, і неба — разьлівы ільноў.
Дзе мой край? Там, дзе людзі ніколі ня будуць рабамі,
Што за поліўку носяць ярмо ў безнадзейнай турме,
Дзе асілкі-хлапцы маладымі ўзрастаюць дубамі,
А мужчыны, як скалы, — ударыш, і зломіцца меч.
Дзе мой край? Там, дзе мудрыя продкі у хвоях паснулі,
Дзе жанчыны, як радасны сон у стагах на зары,
А дзяўчаты, як дождж залаты. А сівыя матулі,
Як жніўё з павуціньнем і добрае сонца ўгары.
Там зьвіняць няўміручыя песьні на поўныя грудзі,
Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок.
Тая гордая мова, якую й тады не забудзем,
Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок.
Ты — наш край. Ты — чырвоная груша над дзедаўскім домам,
Лістападаўскіх зьнічак густых фасфарычная рацьь,
Ты — наш сьцяг, што нікому, нікому на сьвеце, нікому
Не дамо абсьмяяць, апаганіць, забыць ці мячом зваяваць.
Мы клянёмся табе баразной сваёй першай на полі
І апошняй ральлёй, на якую ўпадзём у журбе.
Мы клянёмся табе, што ніколі,
Ніколі,
Ніколі,
Так,
Ніколі ня кінем,
Ня кінем,
Ня кінем цябе.

ЛЮДЗІ ДОБРАЕ ВОЛІ.

"Беларускі Сьвет" атрымаў наступныя грашовыя ахвяры:

Сп./Сп. Часлаў Буцька і Антон Бяленіс — $50.00
Сп. Сяргей Карніловіч — $45.00
Спд. В. Пашкевіч — $26.50
Сп. Янка Бруцкі — $12.00

Вялікае Вам ДЗЯКУЙ!

АЖАНІЦЦА— ТРЭБА ЗНАЦЬ

Беларуская народная песня

Апрацоўка К. ПАПЛАЎСКАГА



Ажаніцца — трэба знаць,
Жонцы волі не даваць.
Ох, я, бедны я,
Бедна галоўка мая.

Цэлы тыдзень па вяселлі
Не вылазіла з пасцелі.
Ох, я, бедны я,
Бедна галоўка мая.

А як толькі паднялася,
Дык камандаваць ўзялася.
Ох, я, бедны я,
Бедна галоўка мая.

Сцялі ложак, мяці хату,
А я збегаю да таты.
Ох, я, бедны я,
Бедна галоўка мая.

Сагрэй ваду, сячы дровы,
Ды каб быў абед гатовы.
Ох, я, бедны я,
Бедна галоўка мая.

Як напала, як насела,
Галава аж палысела.
Ох, я, лысы я,
Лыса галоўка мая.

І не бачыў, як то стала,
Мяне жонка асядлала.
Ох, я, бедны я,
Бедна галоўка мая.

Ажаніцца — трэба знаць,
Жонцы волі не даваць.
Ох, я, бедны я,
Бедна галоўка мая.

СКАЗАЎ ЯК ЗВЯЗАЎ

Беларускія прыказкі, прымаўкі, жарты і выслоўі

А мой жа ты свой, ды не родненькі.

Абы з воч, дык і з памяці проч.

Адзін задзірака, другі непаддавака.

Ажаніўся, і — як за хмару закаціўся.

Да яго ані прыступу, ані доступу. (Пра гордага або бюракрата).

Пакінь сваё «дàм» к калядáм.

Была ў сабакі хата, ды ад дажджу згарэла.

Баліць у грудзях — не быць у людзях.

Эх, была ў мяне сіла, як маці насіла.

Біцца не гадзіцца, лепш бы піхнуў, каб не дыхнуў.

Ваша і сяло не весяло. Быў адзін пяюн, ды й таго забіў пярун.

Будзі спакойнага, дай паспаць увішнаму.

У яе хаце ўсё тольні бліснь ды ясь. (Гаворыцца пра ахайную гаспадыню).

Змяла — не змяла, абы ў мяліцы пабывала.

— Дзе быў?
— На базары.
— Чым гандляваў?
— Варон прадаваў: адну збыў, другую купіў.

Бубніць, як з бочкі. (Пра нізкі голас).

«Смелы» — гаў-гаў ды пад лаўку.

Герой бабы старой.

Лад дык лад, а не — дык няма чаго і гарод гарадзіць.

Гляджу, бачу і розуму не трачу.

— Гразь, гразь, чаму не гарыш?
— О, я б гарэла, каб не была карэла.

Твая хвароба, як маё здароўе. (Так дакараюць сімулянта і гультая).

Дабрахвочы глядзіць цюцькам скнары ў вочы.

Дагадзіў, як зброднай сучцы варам.

Добра брэшаш, шкада вешаць.

Дурному ўсё капейкі здаюцца.

Еш, пакуль не запяеш.

Дзякуем за тую, проша другую. (Застольная падзяка за песню).


Ешце, дзеткі, крупеня тлусценькая: два яечкі варыліся.

Жыве, як сад у пагоду.

Звер — не звер, а чорт яму вер.

Любіць капуста, каб была тлуста.


Спагадай свет трымаецца.




— Хіба вам гэтая скрыня даражэй за сына?!



На літасць пераможцы...



— «Хуткая дапамога»? Тут чамусьці аднаму вельмі, вельмі кепска...



У аб'езд... забабонаў



Полацкі Сафійскі сабор.

EDITOR & PUBLISHER: NIKOLAS PRUSKY
1086 FOREST HILLS AVE., SE. GRAND RAPIDS, MICH. 49506

© PDF: Kamunikat.org 2018
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2018